# ЗЯРНЯТКА 6

15 кастрычніка 2017 г. XXVIII Звычайная нядзеля, Год А

*Усіх, каго сустрэнеце, запрасіце на вяселле* — *Мц 22,1-10*



Адказваючы, Езус зноў расказаў прыпавесць першасвятарам і старэйшынам народа: Валадарства Нябеснае падобнае да караля, які справіў вяселле для сына свайго. І паслаў слугаў сваіх паклікаць запрошаных на вяселле, але не хацелі прыйсці.

Зноў паслаў іншых слугаў, кажучы: Скажыце запрошаным: вось я прыгатаваў гасціну маю, зарэзаны валы мае і адкормлена жыўнасць, і ўсё падрыхтавана. Прыходзьце на вяселле!

Але яны пагардзілі і адышлі: хто на сваё поле, а хто на свой гандаль. Астатнія ж, схапіўшы слугаў ягоных, зняважылі і забілі іх.

Кароль жа раззлаваўся і, паслаўшы войска сваё, знішчыў забойцаў гэтых і падпаліў іхні горад.

Тады ён кажа сваім слугам: Вяселле гатова, але запрошаныя не былі годнымі. Таму пайдзіце на ростані і ўсіх, каго сустрэнеце, запрасіце на вяселле. І слугі тыя, выйшаўшы на дарогі, сабралі ўсіх, каго знайшлі: і кепскіх, і добрых. І напоўнілася вяселле гасцямі.

**На доўгія дні пасялюся я ў доме Пана.**

# Знайдзі на малюнку адпаведныя рэчы. Размалюй малюнак.




**Малітва:** Хвала Табе, Пане Езу, за сённяшні дзень, за ўсе дары, якія Ты мне даеш. За Тваю апеку і любоў, што Ты клапоцішся пра мяне. Я давяраю Табе маё жыццё. Дзякую Табе за ўсё! Амэн.